


# 21 ЛЮТАГА – МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ РОДНАЙ МОВЫ

*Родная мова – матчына мова,*
*ты нашых думак – уток і аснова…*
*Кожнай драбніцы ты варта пашаны,*
*Кожнае слова вякамі стварана і навякі жыць застанецца,*
*Вечнае так, як народнае сэрца.*

*У. Дубоўка*

## Кніжна – ілюстрацыйная выстава «Родная мова, цудоўная мова»

Міжнародны дзень роднай мовы – штогадовае свята, заснаванае ў 1999 годзе рашэннем Генеральнай сесіі ЮНЕСКА. Яго галоўная мэта – захаванне моўнай і культурнай разнастайнасці ў свеце, падтрымка нацыянальных моў і культур, а таксама забеспячэнне права кожнага грамадзяніна карыстацца роднай мовай.

Да дня роднай мовы ў бібліятэцы арганізавана і дзейнічае кніжна – ілюстрацыйная выстава «Родная мова, цудоўная мова», з якой можна азнаёміцца, наведаўшы бібліятэку.

